Еще в XVI веке наш знаменитый просветитель Франциск Скорина знал рецепт лечения «суицидального национализма». Он утверждал, что людей объединяют не столько религиозные, сколько общечеловеческие и национально-культурные ценности. У него общечеловеческие и национальные ценности гармонично сочетаются. Богатство общечеловеческой культуры раскрывается в многочисленных образах национальных культур.

В условиях глобализации национальная культура сама по себе представляет высокую ценность и является важнейшим фактором конкурентоспособности. Только уникальные, отличные от других товары, вещи, знаки, имена, ноу-хау могут быть истинно конкурентными в мировой экономике, чего можно достичь, опираясь только на самобытную культуру, этнокультурные и этноэкономические истоки. Поэтому сегодня решающее значение приобретает национальная идентичность, фундаментальным основанием которой является национальная идея. В ней всё аккумулируется и из нее всё произрастает, в ней в том числе и наше белорусское «самостоянье» и самобытность, смысл исторического существования белорусов в мире.

«Если ты выстрелишь в прошлое из пистолета, будущее выстрелит в тебя из пушки»

Детство имеет решающее значение как в жизни отдельного человека, так и в истории народа. Оно во многом предопределяет будущее. Поэтому любая нация не может быть жизнеустойчивой без осмысления своего прошлого. Невозможно вообразить белорусскую национальную идею без обращения к истории народа. Она уходит своими корнями в историю древнего Полоцка и первых христианских просветителей Евфросиньи Полоцкой и Кириллы Туровского, Климентия Смолятича и Авраамия Смоленского. Ее становлению способствовали философско-гуманистические идеи Франциска Скорины, Сымона Будного и других.

Мы всегда будем помнить, что на путь практического воплощения белорусской национальной идеи первым встал наш национальный герой Кастусь Калиновский.

На рубеже XIX–XX вв. творчество Франтишка Богушевича, Игната Абдираловича, Янки Купалы, Якуба Коласа, Алоизы Пашкевич, Максима Богдановича, Вацлава Ластовского и многих других явилось дальнейшим этапом в развитии белорусской национальной идеи. Результатом в том числе и их деятельности стало провозглашение Белорусской Народной Республики – первой попытки построения белорусской государственности.

Республика Беларусь, БССР, БНР – лишь верхушка в исторической цепи становления белорусской государственности.

И в новейшей истории надо видеть позитивные результаты

Важно ценить не только историю, но и современные достижения, поскольку позитив лучше способствует национальной консолидации, чем негатив. Любые успехи побуждают гордиться за страну, вызывают интенции национальной саморефлексии, «роздум» о настоящем и будущем народа. Поэтому и в новейшей истории надо видеть позитивные результаты. Например, для укрепления государственности важным было то, что первый Президент в условиях раздрая после распада СССР сохранил государственные предприятия и, соответственно, рабочие места, восстановил систему управления и создал мощный государственный аппарат. Жесткая вертикаль власти предотвратила проявления анархии, пресекла формирование мафиозных группировок, укротила дерзость криминальных авторитетов. Преференции со стороны России были направлены в том числе и на сохранение минимальных социальных стандартов, регулярную выплату пенсий и прочее.

Чрезвычайно важным было то, что Президент первым преодолел боязнь самостоятельности, и его волевому примеру последовали административные и хозяйственные кадры. Это явилось важным фактором сохранения суверенитета.

Минск может стать местом нового широкомасштабного диалога

Белорусская национальная идея как основа нашей идентичности должна быть одновременно и общечеловеческой. Нам надо переосмысливать, в том числе и с этих позиций, роль молодого белорусского государства в мире и в развитии нашего социума и жизни народа.

Находясь в геополитической точке межцивилизационного напряжения между Западом и Россией, мы обречены развивать хорошие отношения с ними. Мы должны показывать примеры высокого сотрудничества, рождать региональные и международные инициативы для партнерства и конвергенции геополитических соперников. Содействовать построению миролюбивого пространства от Лиссабона до Владивостока, формированию своего рода соединенных европейско-российских штатов (СЕРШ). И надо только приветствовать, что Президент «глубоко убежден, что Минск может стать местом нового широкомасштабного диалога по вопросам безопасности государств в Евро-Атлантике и Евразии».

Национальная идея должна быть монополизирована государством

Не только без прошлого, но и без мечты нет будущего. Национальная идея, образно говоря, это «три в одном»: и «прошлое», и «настоящее», и «будущее» народа. Национальная идея – это объединительная идея для всего общества, всех граждан, если, конечно, они стремятся к построению своего национального государства.

Уже в силу этого она не может быть приватизирована узким кругом лиц или партий (например, Партией БНФ, которая претендует быть ее монопольным носителем). На мой взгляд, национальная идея должна быть монополизирована государством и стать основой государственной идеологии. Из этого вытекает и миссия руководства, которая заключается, помимо прочего, в том, что власть должна использовать все имеющиеся в ее распоряжении средства и инструменты для практического воплощения национальной идеи в жизнь. Только в этом случае белорусское общество обретет столь долгожданную «объединительную идею» и дело расцвета белорусской нации, экономики и культуры будет продвигаться успешно.

Важная задача – пропаганда национальной идеи

Национальная идея, если она овладевает массами, неизбежно ведет к идеологии национализма – к политической программе действий национальных элит для реализации этой идеи. Конечно, идеология национализма не может не включать в себя определение «нации». Существует много подходов к пониманию нации. В контексте темы важно отметить лишь то, что нация является единством трех компонентов: волевого, культурного и политического. Воля активизирует деятельность национальных элит, а через них и граждан. Она превращает аморфное этническое сообщество в политически активную нацию. Нации формируют собственные культуры, между которыми происходит постоянная конкуренция. Защита национальной культуры и национальных интересов невозможна без создания и укрепления суверенного национального государства. Именно последнее обстоятельство и является одной из глубинных причин формирования государственной идеологии для консолидации и мобилизации граждан, которые разделяют национальную идею и стремятся к построению национального государства. Из этого следует, что важной задачей белорусской государственной идеологии, помимо прочих, должна стать пропаганда национальной идеи, с тем чтобы граждане осознавали себя как единое сообщество и в государственно-политическом, и в культурно-историческом, и в нравственно-духовном, и в национальном планах.

Государственная идеология и идеология национализма, таким образом, имеют своим общим основанием национальную идею. Однако на этом их похожесть (одинаковость) и заканчиваются.

Анатолий ЛЕВКОВИЧ,
соучредитель (1991 г.) Белорусской социал-демократической партии (Грамада), председатель оргкомитета республиканского общественно-просветительского объединения «Социал-демократы за диалог и консолидацию», кандидат философских наук, доцент.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Чаму зладзюгі ў кралі аўтамабіль укралі

Папулярная блогерка са Слуцка (100 тысяч падпісчыкаў) паведаміла ў Instagram, што яна, пакінуўшы свой дарагі аўтамабіль, накіроўваецца ў салярый. Праз 15 хвілін машыну ўкралі…

Як зірнуць цвяроза –
Смех дый годзе
Гэты дзіўны масавы бедлам:
Пра сябе расказваць сёння ў модзе,
Здымкі выстаўляць у Instagram.
І таму фіксуюцца на фота
Кожны ўласны ўдых і кожны крок.
…Здзейсніваецца з дзеўкі неахвота,
Толькі атрымала добры ўрок.
Дзеянні свае, свае забавы
Выстаўляе іншым напаказ –
Побыт у яе, маўляў, цікавы.
Так было якраз і ў гэты раз.
«Пакідаю я сваё «Ферары», –
З радасцю паведала яна. –
І іду, сябры мае, ў салярый.
Буду там, напэўна, да цямна».
І такі настрой узнёслы ў кралі –
Загарэлым зробіцца «фасад»!
Дык не дзіва, што машыну ўкралі,
Бо было ў зладзеяў часу шмат.
У народа вопыт ёсць багаты,
Дзеўцы мог бы ён дапамагчы:
Каб «галодным» быў шпіён праклятых,
Некалі вывешвалі плакаты
З заклікам да ўсіх: «Не балбачы!»
* * *
Каламуць такая ў інтэрнэце!
Выстаўляцьмуць хутка ў Instagram,
Што яны сядзяць у туалеце
І, прабачце, што выходзіць там…

Цяпер няма даверу любому кавалеру

30-гадовая жанчына з Шумілінскага раёна сходзіла на спатканне, якое скончылася зваротам у міліцыю. Напрыканцы рамантычнага вечара кавалер доўга трымаў яе за руку, а калі парачка разышлася, з яе пальца знік пярсцёнак. Прычым кавалер паспеў нават прадаць яго за 250 рублёў.

Цвіла вячэрняю парой,
Нібыта ружа, маладзіца.
Чаму ж узнёслым быў настрой?
Павінна мара сёння збыцца.
Вяла яна праз інтэрнэт
З мужчынам хвацкім перапіску.
І зараз ім падвесці след
Пад перапіскай гэтай рыску.
Пазваў нарэшце кавалер
На натуральнае спатканне.
І вось прыйшла яна цяпер
На рандэву ва ўзнёслым стане.
Абраннік досыць малады,
А да таго ж – высокі, гонкі.
Было б няблага сапраўды
Набіцца да такога ў жонкі.
Яна не ведала, на жаль,
Што ў кавалера план каварны…
Гадзіну цэлую амаль
Яны прабавілі ў кавярні.
Затым у парку над ракой
Блукалі ціха па алеі.
Пасля рамантыкі такой
Пабольшалі ў яе надзеі,
Што можа ў іх адбыцца шлюб,
Што ён да гэтага гатовы,
Тым болей што з ягоных губ
Зляталі правільныя словы:
– Хто не гультай, не пустазвон,
Той у жыцці пакажа хватку.
Патрэбна мне, – даводзіў ён, –
Займець сваё жытло спачатку.
І я, павер мне, зараблю
На адмысловую кватэру!
Збіраю нават па рублю…
Ну як не верыць кавалеру?
Зусім не хібны інтарэс!
А болей грэла маладзіцу,
Што ён нахабна не палез
У першы ж вечар пад спадніцу.
Наогул гэты кавалер
Сябе паводзіў без дакукі –
Высакародны меў намер,
Адно што ёй пагладжваў рукі –
Напэўна, гэткім чынам ён
Выказваў ён сваю пяшчоту.
Яна ўзлятала ўвысь душой,
І не стрымаць душы палёту!
Таму не дзіўна, што дамоў
Яна ляцела, як на крылах,
Нібыта для сябе наноў
У гэты вечар свет адкрыла.
Аднак праз некалькі хвілін
Прыйшлося на зямлю спусціцца.
– А каб жа здох ты, сукін сын! –
Праклён паслала маладзіца.
Пярсцёнак знік з яе рукі!
Таму і злосці – нібы ў звера.
Каб стрэла зноў, дык на шматкі
Яна парвала б кавалера.
Перахананаўся ўрэшце клёк
(Хоць прыгнятала сэрца нявісць),
Што раздзяляе толькі крок
Любоў-каханне і нянавісць…
* * *
Мужчыны ў іншыя часы
І з палюбоўніцы, і з жонкі
Здымалі ліфчыкі й трусы.
Цяпер здымаюць з іх пярсцёнкі…

УСМЕШКА МАСТАКА



Прыраўнаваў?

У кампаніі сяброў мужчына распіваў піва ў Мінску на набярэжнай Свіслачы. Недалёка на лавачцы сядзела парачка – хлопец і дзяўчына. Ці то з-за рэўнасці, ці то з-за пламутнення розуму, але 24-гадовы мужчына падышоў да маладых і пачаў біць хлопца па галаве. Праз некалькі хвілін на месцы злачынства была міліцыя. Цяпер «героя» пагражае да трох гадоў турмы.

– Ну не падабаецца мне твая закаханасць у прыгажуню!..

ДЫСКУСІЯ

А чаму гаворка ідзе толькі пра нацызм?

Што такое нацызм і ў чым яго небяспека? Чаму я з гэтым пытаннем звяртаюся ў газету? Справа ў тым, што ў «Народнай Волі» за 15 лютага гэтага года змешчана інфармацыя пад аўтарствам Кацярыны Вольскай «За прапаганду нацызму – да крымінальнай адказнасці!». У ёй паведамляецца: *«Сёння ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь адбудзецца пашыранае пасяджэнне рабочай групы па дапрацоўцы законапраекта, звязанага з прыцягненнем да крымінальнай адказнасці за прапаганду нацызму»*. Ці азначае гэта, што нацызм у нашай краіне дасягнуў небяспечных межаў? Калі гэта так, то якім чынам яго распазнаць, каб сказаць, што закон неабходны і своечасовы? Акрамя прадстаўнікоў афіцыйных структур на пасяджэнне запрошаны прадстаўнікі Партыі БНФ, кампаніі «Гавары праўду!» і Беларускага Хельсінкскага камітэта. Прадстаўнікі Партыі БНФ запрошаны на пасяджэнне разам з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў – гэта ж сенсацыя! Але сенсацыя засталася незаўважанай. Хацелася б дведацца пра вынікі пасяджэння, пра тое, якія прапановы паступілі ад прадстаўнікоў Партыі БНФ і «Гавары праўду!».

На маю думку, прыняцце такіх законаў нясе для грамадства не меншую небяспеку, чым уласна дамарошчаны нацызм. У палітычна неадукаваным, расколатым грамадстве можна прычапіцца да любога жэста, да любога слова, да любога газетнага артыкула, да любога каментарыя...

Дарэчы, а чаму гаворка ідзе толькі пра нацызм? А камунізм? А фашызм? І шмат чаго яшчэ... Зусім нядаўна прачытаў артыкул Сямёна Букчына «Тоска по Сталину» («Народная Воля» за 22 лютага 2019 года). Сталіністы падымаюць галаву. Вось гэта якраз жахліва і небяспечна. Калі штосьці і забараняць, дык пачынаць трэба не з нацызму, а з ідэалогіі камунізму, таму што нацызм, фашызм, тэрарызм – гэта, на маю думку, пачварныя тварэнні камунізму.

Ілля КОПЫЛ, пенсіянер.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Што я ўбачыў у пакоі ўнука…

Добры дзень, «Народная Воля»!
Хачу распавесці пра наш агульны боль.

25 гадоў мінула з таго часу, як у нас пачалі гаварыць пра нацыянальнае адраджэнне. А што зроблена? Можна сказаць, нічога. Назвы вуліц у гарадах у асноўным на рускай мове. Калі раней большасць прадметаў у школах выкладалася на беларускай, то цяпер роднае слова выціснута амаль з усіх падручнікаў. Рэдка які настаўнік размаўляе на беларускай мове. Я ўжо не кажу пра нашых чыноўнікаў, шараговых грамадзян.

Дайшло да таго, што знікае нацыянальная сімволіка. Тое, з чым я нядаўна сутыкнуўся, прывяло мяне ў роспач. Паехаў у госці да дачкі. Заходжу ў пакой унука, якому 16 гадоў. І што вы думаеце ўбачыў на сцяне? Дзяржаўны сцяг Расійскай Федэрацыі. Не Беларусі, а менавіта Расіі.

Відавочна недапрацоўка бацькоў. З юных гадоў трэба было ўбіваць хлопцу ў галаву, што ў нас, беларусаў, ёсць свая сімволіка, ёю трэба ганарыцца, а не чужой. І важна быць патрыётам сваёй краіны, а не суседняй.

Але маем тое, што маем. Бацькі не ўклалі ў галаву хлопца неабходную інфармацыю, не зрабіла гэтага і школа. Затое актыўна прамываюць мазгі дзяцей рускамоўныя тэлеканалы. Ідзе масіраванае замбіраванне нашай моладзі з усходу.

Чаму, чаму бяздзейнічаюць улады?! З такой палітыкай мы сапраўды можам стаць губерняй Расіі.

Алег УРБАНОВІЧ, жыхар г.Ліда.

МНЕНИЕ

О крутости, пользе и вреде

Была недавно по делам в районе Тракторного завода. Вышла из метро и направилась в сторону улицы Ваупшасова. Недалеко от бассейна, там, где улица Буденного упирается в Долгобродскую, установлен огромный рекламный щит: «Дышать чистым воздухом КРУТО». Я аж с шага сбилась! Это ж надо, какая забота в нашем социально ориентированном государстве о людях! Кто ж, как не городские власти, напоминят минчанам, а особенно тем, кто проживает вокруг Тракторного завода, о полезности чистого воздуха? Да, впрочем, почему только о полезности? Судя по этому плакату, до нашего сведения хотят донести, что вдыхание чистого воздуха ставит дышащего в привилегированное положение, относит к числу продвинутых граждан, делает крутым!

Да и не поспоришь: воздух заснеженных Альп или океанского побережья куда как полезнее для вдыхания, нежели воздух заводских районов современных мегаполисов. Надо понимать, те, кто придумал, создал и повесил этот плакат, хотели напомнить минчанам: ребята, что вы тут делаете? Собирайте чемоданы и бегом к свежему воздуху – это круто!

Очень интересно, на какие деньги была создана эта социальная реклама? Может, инвестиции хлынули, и теперь денег хватает не только на строительство бесконечных отелей, торговых центров и спортивных сооружений, но и на экологическое воспитание? Тогда не лучше ли было бы пустить их на озеленение Партизанского и Заводского районов, что, как известно каждому еще со школьной скамьи, значительно улучшает качество воздуха?

Сколько стоило создать и повесить эту простыню? А еще – как будет утилизирован этот плакат, выполненный, думаю, из далеко не самых экологичных материалов, и какой ущерб экологии и чистому воздуху будет нанесен этой утилизацией? Или, по мнению создателей этого шедевра, польза от него намного превосходит любой вред?

Ирина ДЕРГАЧ, минчанка.

ГОРОДСКАЯ ЖИЗНЬ

Объявления на подъездах – это разве что бабушкам почитать после прогулки

Есть привычки, которые нам, минчанам, все же пора оставить в прошлом. Например, клеить объявления на двери подъезда, причем каким-нибудь столярным клеем, чтоб уж не отодрать. Особенно меня удивляют объявления о репетиторстве по русскому языку: ну, я такому человеку не доверила бы ребенка, потому что филолог, лингвист, педагог не будет продавать свои услуги таким, простите, варварским способом.

Я вот пробовала помыть двери подъезда, когда они уже от бумажек превратились в помойку, – получается плохо. Хороший все-таки клей выпускает наша промышленность! Но, если серьезно, кто сейчас пользуется информацией, которая распространяется таким дедовским способом? Наверное, единицы. По-моему, все активные потребители товаров и услуг ищут их через интернет. А объявления на подъездах – это разве что бабушкам почитать после прогулки. К тому же как неряшливо от них выглядят наши дома!.. Все-таки Мингорисполком должен навести порядок с объявлениями на подъездах жилого фонда столицы.

А адрес именно этого подъезда на фото – дом №21 на улице Якуба Коласа. Рядом Академия наук, БНТУ, Белгосфилармония… Центр – и вот такое неряшество.



Виктория ДРОЗД.

ЛИКИ ИСТОРИИ

Достоин ли канонизации Иосиф Семашко?

2019 год Белорусский Экзархат РПЦ объявил годом памяти митрополита Иосифа Семашко. Планируются разные мероприятия, посвященные этой особе, поспособствовавшей присоединению униатов к Русской православной церкви. Такой пиетет к митрополиту вызывает слухи в церковных кругах о скорой его канонизации. И это сильно возмущает ту часть нашего общества, которая изучает историю и знает о насильственном характере этого присоединения.

Исходя из того, что мнение гражданского общества и простых прихожан может быть не принято во внимание на предстоящих мероприятиях, я хотел бы донести свое понимание этой истории до читателя, то есть посмотреть на события двухвековой давности взглядом человека, который не может принять приглаженную версию истории РПЦ.

Несколько слов о церковной унии. В 988 году произошло крещение князем Владимиром Киевской Руси. В 1299-м митрополит Максим переносит митрополию из Киева во Владимир (Владимиро-Суздальское княжество на тот момент входило в состав Золотой Орды). Это вызвало досаду у Константинопольского патриарха, и в 1317 году на Киевскую кафедру (это территория Великого Княжества Литовского) был назначен митрополит Феофил, который перенес митрополию в столицу, в Новгородок.

Обращаю внимание читателя: Орда и ВКЛ – два разных государства с различным политическим устройством. Соответственно и две разные митрополии с отличной друг от друга конфессиональной обстановкой находятся в подчинении у Константинопольского патриарха.

По традиции того времени, митрополиты предъявляли друг другу территориальные претензии, подкрепляя их интригами, шантажом и военной силой «своих» князей. Разница была лишь в том, что в Московском княжестве светские и духовные власти искали взаимовыгодные пути сотрудничества, а в ВКЛ верховные власти не оказывали поддержки православной церкви, тем самым ослабив ее политические позиции на восточных рубежах.

Все изменилось после развала Золотой Орды: Московское княжество захватило Казань и Астрахань, стало мощнее. И в 1561 году Иван Грозный вторгся в ВКЛ (теперешнюю Беларусь), отметив свой путь невиданной резней и зверствами. К примеру, в Полоцкой земле были истреблены практически все жители (в большинстве своем православные), край на долгие годы обезлюдел.

Эта война показала, что выборная власть и шляхетское ополчение ВКЛ бессильны против абсолютной монархии и регулярной армии московитов. ВКЛ, обессиленному войной, необходима была помощь, но союзная Польша воспользовалась моментом и потребовала политических уступок, которые и были закреплены в Люблинской унии (1569), когда и образовалась федеративная Речь Посполитая.

В советских учебниках писали, что произошел захват православной Беларуси поляками, но позвольте: в ВКЛ продолжали действовать Вальный сойм, юридически независимое правительство, местная администрация, державная канцелярия, была своя армия, действовали свои законы – Статут ВКЛ. Все это функционировало практически до XIX века. Какой же это захват? Очевидно, что для ВКЛ союз с Польшей был единственной возможностью избежать захвата со стороны Москвы.

К сожалению, на этом беды не закончились. В 1589 году митрополит Иов стал патриархом, и в ВКЛ сообразили, что Москва намерена взять «братьев по вере» под свое крыло. Поэтому через семь лет была подписана Брестская уния.

Но войны с Московией избежать все же не удалось – она началась в 1654 году под лозунгом «унии не быть, латинству не быть, жидам не быть». В советской исторической литературе почему-то говорилось о «польской войне» Алексея Михайловича (Тишайшего) за «исконно русские» земли. Реально же война велась против литвинов (самоназвание белорусов того времени). Тогда погиб каждый второй житель ВКЛ, большинство из которых были православные.

Историки считают, если бы не было той войны, то население нашей страны сегодня составляло бы 25–30 миллионов человек (Г.Сагановіч «Невядомая вайна»).

Теперь о переводе униатов в православие. Сразу хочу отметить: он был востребован прежде всего Российской империей. Никакого духовного порыва у народа не было. И на конец XVII века на территории ВКЛ проживало 80% униатов. Значит, предки абсолютного большинства нынешних православных белорусов являлись униатами.

Униат Иосиф Семашко, пожив в Петербурге, сравнив скромные храмы Беларуси и золото соборов России, видимо, выбрал золото, а с ним сытую жизнь, ласку властей и награды. В 1827 году он пишет записку «О положении в России униатской церкви и средствах возвратить оную на лоно церкви православной». На записке появляется резолюция императора: «Я радуюсь, что случайно нашел в униатской церкви человека, который может помочь нам в деле, которым непрестанно занимаюсь и с помощью Божьей приведу в исполнение. Передайте ему, что я им доволен».

Иосифу Семашко был пожалован крест с бриллиантами, вскоре он становится епископом, а затем митрополитом.

По настоянию митрополита Иосифа в епископат униатской церкви были внедрены агенты влияния Антоний Зубко, Иосафат Жарский и Василий Лужинский, которые предварительно дали письменные обещания о переходе в православие. Затем по его инициативе был создан Секретный комитет по униатским делам – для оперативного взаимодействия с имперской администрацией. Используя свои неограниченные должностные возможности и опираясь на силовые ведомства, Семашко со товарищи начали ломать духовенство, что называется, через колено. В ход шли шантаж, запугивание, увольнение за штат, ссылка на покаяние в монастырь, самых стойких ссылали в Сибирь. Сжигались униатские молитвословы, богослужебные книги, уникальные иконы, перестраивались храмы, на вакантные должности присылались попы из России.

Непосредственно перед так называемым объединительным Полоцким собором в 1939 году в Петербурге была разработана инструкция, предписывавшая наблюдать за духовенством, найти удобные места для размещения карательных отрядов, выслать в Россию несогласных священников и т.д. Вот в таких условиях и проходил собор.

А что же народ? А его угрозами, штрафами, тюрьмой и палками власть учила молиться по русскому образцу – других методов империя не знала.

При всем желании в жизнеописании митрополита Иосифа Семашко вы не найдете сведений о долгих молитвах, изнурительных постах. А в деяниях его нет любви, милосердия, сострадания и терпения. А вот жестокости и ненависти, какая бывает только у прикормленных предателей, – хоть отбавляй.

Возможно, для РПЦ митрополит и является светильником веры, но для белорусов он всего лишь заурядный церковный деятель, который использовал свои сомнительные способности ради личных амбиций.

Желание канонизировать митрополита Иосифа, на мой взгляд, имеет политическую подоплеку: РПЦ таким образом хочет поставить жирную точку в идее «русского мира» и «триединого народа», а также закрепить в сознании миф о том, как русские спасли белорусов от «нечестивых латинян».

Если белорусское общество проглотит эту пилюлю, то «русский мир» получит в свое распоряжение дополнительные козыри. После этого к чему разговоры о независимости? После причисления к лику святых угнетателя белорусов Иосифа Семашко следующим на канонизацию нам предложат генерал-губернатора Муравьева-вешателя…

Павел МАЛИЧ.
г.Иваново.

ПРОТЕСТ



Испания: тысячи людей требовали от властей большего внимания к сельским районам

Испанцы вышли на демонстрацию в Мадриде в воскресенье, требуя от правительства мер для сдерживания депопуляции сельских районов. Воскресный марш под лозунгом «Восстание опустошенной Испании» организовали низовые группы из сельских районов страны.

90% населения Испании сегодня проживает на 30% территории страны, а именно в Мадриде и прибрежных районах. Остальные 10% населения разбросаны на остальной территории страны.

Демонстрация состоялась перед всеобщими досрочными выборами в Испании, которые должны пройти 28 апреля. Сельские районы могут сыграть ключевую роль в принятии решения о сохранении у власти социалистов. Согласно испанскому законодательству о выборах, малонаселенным регионам предоставляется больший политический вес.

ТРАГЕДИЯ

Лесной пожар в Китае: десятки спасателей сгорели заживо

Как сообщают китайские СМИ, спасатели обнаружили в лесу на высоте 4 тысяч метров над уровнем моря в провинции Сычуань останки 26 человек.

После того как 30 апреля на территории Ляншань-Иийского автономного округа разгорелся масштабный пожар, 689 человек отправили на борьбу с огнем, а на следующий день из-за резкой смены направления ветра пожар вспыхнул с новой силой, и 30 спасателей пропали без вести.

Также загорелся лес в провинции Шаньси, в результате чего было эвакуировано более 3800 человек, а на борьбу с огнем направили шесть пожарных самолетов, свыше 30 расчетов и 150 человек.



ЗНАКОМЬТЕСЬ!

Зузана Чапутова – президент Словакии

Зузана Чапутова родилась 21 июня 1973 года в Братиславе, но большую часть жизни прожила в городе Пезинок, расположенном неподалеку от столицы.

В 1991–1996 годах будущий президент училась на юридическом факультете Братиславского университета имени Коменского и одновременно работала в администрации города Пезинка.

Большую часть жизни проработала адвокатом в общественном секторе, в том числе в фонде «Открытое общество» Сороса – и это было одной из самых распространенных причин ее критики во время предвыборной кампании. Интересно, что сама Чапутова подает сей факт вовсе не как слабость, а как преимущество. Цитата:

«Я посвятила всю свою профессиональную жизнь справедливости. Будучи еще студенткой, инициировала ряд проектов по оказанию помощи малоимущим, в том числе детям, подвергшимся насилию в семье. Как адвокат была на стороне тех, кто не имел денег для защиты своих прав. Как гражданский активист, защищала общественные интересы от интересов политических партий или бизнес-групп. Как президент хочу отдать все свои силы на борьбу с беззаконием и давлением».

В 2018 году женщина развелась с первым супругом Иваном Чапутой и одна воспитывает двух дочек 15 и 18 лет. С прошлого года находится в гражданском браке с известным музыкантом, автором песен и фотографом Петром Конечным.



Была избрана заместителем председателя партии «Прогрессивная Словакия». В начале марта 2019 года вышла из ее состава.

Зузана Чапутова – первый президент-женщина за историю Словакии.

На выборах Чапутова баллотировалась как независимый кандидат, правозащитница и адвокат.

На выборы она пошла всего с тремя пунктами в программе:

*1. **Справедливость для всех*** – обещает реформировать правоохранительную и судебную системы и побороть коррупцию на самом высоком уровне.

*2. **Достойная жизнь для пожилых людей*** – будет добиваться увеличения расходов на социальную сферу, в первую очередь – на обеспечение пенсионеров.

*3. **Защита окружающей среды*** – вынесет тему экологии на государственный уровень и возьмется за борьбу против вырубки лесов, охрану национальных заповедников и т.п.

Хотя есть у Чапутовой и крайне необычные для консервативной Словакии взгляды. Например, она выступает за разрешение усыновления детей однополыми парами и в защиту права женщин на аборты.

Из-за этого против нее даже объединились церковные иерархи. Всего за несколько дней до первого тура выборов архиепископ Трнавский Ян Орош сказал, что голосование за Чапутову будет «тяжким грехом», и призвал прихожан этого не делать.

Сама же кандидатка в президенты страны держалась во время всей предвыборной кампании твердо, но неагрессивно и не доходила до личных нападок.


«Встаньте на пути зла – вместе мы сделаем это», – так выглядел лозунг на ее предвыборных плакатах.

НУ И НУ!

В Японии обнаружили древнейший камень

В префектуре Симане обнаружен древнейший на архипелаге камень. Его возраст оценивается в 2,5 миллиарда лет.

Предыдущий «рекордсмен» среди древних камней Японии был обнаружен в 1970 году в префектуре Гифу. Его возраст – около двух миллиардов лет. Он также состоит из гнейса – метаморфической горной породы, главными минералами которой являются плагиоклаз, кварц и калиевый полевой шпат.



У СОСЕДЕЙ

Украина на распутье: выбирают между нежелательным и невозможным?

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Зеленский показался новым

Три года назад заговорили о возможности выдвижения кандидатом кого-либо из популярных деятелей культуры. Не писателей, не художников – поп- и рок-звезд. Открывал этот список Святослав Вакарчук.

Но Вакарчук выдвигаться не стал. Его место в рейтингах занял Владимир Зеленский, руководитель шоу-студии «Квартал 95», популярный киноактер и телеведущий. Этот удачливый артист-бизнесмен получил рейтинг за счет раскрутки на телевизионном канале «1+1» (в просторечии – на «Плюсах»), принадлежащем олигарху Игорю Коломойскому. У Коломойского, в должности главы Днепропетровской области отстоявшему свой регион от российского давления, не сложились отношения с новым руководством страны, так что он был вынужден даже расстаться со значительной частью бизнеса. Оттого выдвижение Зеленского начали приписывать интригам Коломойского.

Но направление было уловлено верно. Молодые люди, еще не успевшие попробовать собственного хлеба, увидели в нем надежду. Молодой, остроумный, успешный – он будет другим, не таким, как все эти Порошенки, Тимошенки, Януковичи. Он самореализовался – сможем реализоваться и мы.

При этом Зеленский в ходе кампании не выдвинул ни одной новой идеи, не сформулировал ни одного реально воплощаемого предложения. Он показался новым – но стал ли он новым?

Выбор не из легких

Политологи называли последние президентские выборы в США выбором между нежелательным (Хиллари Клинтон) и невозможным (Дональд Трамп). Сейчас ситуация повторилась в Украине уже с другими персонажами. Нежелательным оказался Петр Порошенко, невозможным кажется Владимир Зеленский.

Но страна, находящаяся в состоянии войны, не может не выбрать своего легитимного и признаваемого мировым сообществом главу.

Не завидую я своим украинским друзьям. Выбор не из легких.

Александр ФЕДУТА.

СВЕЦКАЯ ХРОНІКА

Таццяна МАРХЕЛЬ: «Жыццё трэба ўспрымаць як падарунак!»

Днямі ў Dipservice Hall прайшла дабрачынная акцыя Red Dress & Lamoda. Усе сродкі ад мерапрыемства накіравалі ў дабрачынны фонд «Шанц» для лячэння людзей з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі.

Па подыуме ў шыкоўных уборах чырвонага колеру прайшліся вядомыя жанчыны Беларусі: сцэнарыст і пісьменніца **Тамара Лісіцкая**, намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 1-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска **Марына Рэміша**, жонка саветніка пасольства Украіны **Наталля Сухавецкая**, актрыса Тэатра імя Горкага **Аксана Лясная**, вядучая музычных праграм Радыё «Мір» **Ірына Клёнава**, старшыня Мінскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын" **Святлана Сарока**, прэс-сакратар бізнес-школы ІПМ **Вольга Чэкулаева**, мадэль і тэлевядучая **Ірына Рамбальская**, балерына, заслужаная артыстка Беларусі **Марына Вежнавец**, вядучы менеджар Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця **Вольга Кузняцова**, жонка Ганарового Консула Рэспублікі Харватыя ў Рэспубліцы Беларусь **Кацярына Любецкая**, гімнастка **Любоў Чаркашына**, спявачка **Ларыса Грыбалёва**, народная артыстка Беларусі **Таццяна Мархель** і іншыя.

Актрыса Таццяна Мархель стала сапраўднай зоркай вечара! Гледзячы на яе, міжволі пазайздросціш: не кожная жанчына ў 80 гадоў можа так шыкоўна выглядаць!



Вольга Чэкулаева, Таццяна Мархель і Ларыса Грыбалёва.

Можа, у Таццяны Рыгораўны памылка ў пашпарце? Ці яна кожны дзень ужывае маладзільныя яблыкі?

– Яблыкаў няма, але вось на падаконніку якраз узышлі агуркі і кукуруза, – *смяецца Таццяна Мархель*. – Канешне, глупства садзіць кукурузу ў хаце, але я паспрабавала проста садзіць яе ў агародзе – не выспявае, дык вырашыла зрабіць расаду. І вось вырасла на акне такая здаровая! Я кукурузу люблю замарожваць. Яна такая смачная!

А што тычыцца акцыі «Чырвоная сукенка», то я, канешне, хвалявалася. А ў гэты дзень рaптам адчула сябе не вельмі і нават паспрабавала адмовіцца ад удзелу ў апошні момант. Але не атрымалася. І я ні на секунду не пашкадавала, што прыйшла. Гэта вельмі цікава! І карыснае мерапрыемства. Многа самастойных жанчын, якіх я не ведала раней. З гумарам, прыгожыя, кожны са сваім заняткам, поглядам на жыццё. Такія мерапрыемствы дадаюць упэўненасці ў сабе.

Для мяне рэжысёр у тэатры – самы блізкі чалавек. Мы з ім робім адну справу, спектакль, і калі адносіны не вельмі любоўныя складваюцца, то нічога і не атрымаецца. Але ў мяне такі ўзрост… Мне ў тэатры адкрытым тэкстам сказалі: маўляў, п'есы на ваш узрост ужо не пішуцца… А тут, на подыуме, да мяне так добра паставіліся!..

Мне дзеці даслалі фотаздымкі з мерапрыемства… Самае смешнае, я цяпер раніцай прачынаюся і пасля малітвы «Ойча наш» гляджу на гэтыя фота *(смяецца)*.

– Ну дык вы там сапраўдная зорка!

– Ну вось, трэба не баяцца такія рэчы рабіць. У мяне вельмі многа засталося нечаканых эмоцый і прыемных момантаў ад гэтага мерапрыемства…

– Але вы так і не распавялі, як захавалі вось гэты бляск у вачах. І маладосць, імпэт, прагу жыцця… Ну хто, гледзячы на гэтыя фотаздымкі, паверыць, што тры месяцы таму вы святкавалі 80-годдзе?

– Ну так, мусіць, памылка ў пашпарце *(усміхаецца)!*

Мая мамачка да 96 год была з намі і таксама добра выглядала, песні спявала. Яна была, а я жыла побач. Ніколі не забудуся пра адзін выпадак. Муж зрабіў «зігзаг», і я засталася адна з трыма дзецьмі. Я прыехала да мамы, яна тады ў Вілейцы жыла. І ўжо села ў аўтобус дахаты ехаць, гляджу – мама бяжыць: «Пачакай!» Я выскачыла з аўтобуса, а яна мне працягвае скамечаныя грошы, сваю пенсію, якую атрымлівала ў калгасе. «Бяры, дачушка, у цябе ж дзеці…» У мяне перад вачыма гэты выпадак стаіць! Тады мяне сапраўды дзеці трымалі…

А сёння…

Жыццё трэба ўспрымаць як падарунак. Кожны дзень – падарунак! Якім бы ён ні быў! А ад падарункаў настрой лепшы робіцца. І бляск у вачах. І дзякуй Богу, што мне гэтыя падарункі з неба пакуль яшчэ сыплюцца!..

Марына КОКТЫШ.

ЧУЛІ?

Ярмошына назвала ўкраінскія выбары бездакорнымі

Кіраўнік ЦВК Лідзія Ярмошына, якая была назіральнікам на ўкраінскіх прэзідэнцкіх выбарах, распавяла СТБ, што ў яе няма ніякіх сумневаў у выніках выбараў.

«Можна павіншаваць маіх калег з бездакорнай арганізацыяй выбарчага працэсу. Хоць кампанія была насычаная. Вялікая колькасць кандыдатаў. Гэта быў вельмі сур'ёзны выклік для ўсёй выбарчай сістэмы, але яна справілася, і я думаю, што ніякіх сумневаў у атрыманых выніках няма і не можа быць», – сказала Ярмошына.

ПАМЯЦЬ

Згадайма Кіма Хадзеева

4 красавіка ў мінскай краме «Акадэмкніга» пройдзе прэзентацыя кнігі пра легендарнага мінскага інтэлектуала Кіма Хадзеева (1929–2001), які без пасады і афіцыйнага прызнання набыў у сталічным асяроддзі славу эксперта ў самых розных галінах чалавечай дзейнасці.


Ён пісаў на заказ кандыдацкія дысертацыі, прыгодніцкія раманы, распрацоўваў эканамічныя праграмы. Больш за паўсотні аўтараў паспрабавалі аднавіць у сваіх успамінах і артыкулах шматгранны і складаны вобраз К.Хадзеева.

Прэзентацыя кнігі, якую склалі Аляксандр Сушкоў і Алена Будзінайтэ, пройдзе ў межах кніжнага фестывалю «Прадмова». Пачатак імпрэзы ў 20.00.

Антон ЗАГОРСКІ.

ДЫЯЛОГІ

Міхась СКОБЛА – Васіль ЗУЁНАК



«За кухонным сталом усе смелыя!»

Фізік Ньютан, дзякуючы яблыку, адкрыў закон сусветнага прыцягнення. Паэту Васілю Зуёнку яблык дапамог увайсці ў літаратуру, яго візітоўкай на доўгія гады стаў «падслуханы» ў садзе верш, які потым бясконца цытаваўся: «Ніхто не пачуў: яблык упаў дасвеццем – / ля Халопеніч, на Беларусі. / Ніхто не пачуў – ні людзі, ні травы, ні вецер… / Ніхто. А шар зямны здрыгануўся». У радках гэтых засведчана не толькі сусветнае прыцягненне, але і сусветная спагадлівасць. Думаецца, невыпадкова, менавіта Зуёнкавым вершам было наканавана абляцець «шар зямны» на касмічным караблі. Як адправіць кнігу ў космас, а на зямлі дажыць да дыяментавага вяселля – паэт расказаў у рубрыцы «Дыялогі».

«Улада пільнавала, каб наклад «Зорькі» не перавышаў наклад «Піянера Беларусі»

– Васіль Васільевіч, пасля школы вы, відаць, меркавалі вярнуцца ў школу – скончылі Барысаўскае педвучылішча. А ніколі не шкадавалі, што так і не сталі настаўнікам? Сеялі б разумнае, добрае, вечнае…

– Шкадавання ў мяне не было, бо пасля педвучылішча і журфака БДУ я 6 гадоў працаваў у рэдакцыі газеты "Піянер Беларусі". І весь, як кантактаваць з дзецьмі, чым іх захапіць. Мне вельмі спатрэбіліся атрыманыя ў вучылішчы метадычныя веды. А пасля я рэдагаваў часопіс "Бярозка" – меў справу з падлеткамі. Штодзень мне на стол трапляў стос лістоў з творамі школьнікаў. Трэба было кожнаму нешта падказаць, пахваліць, абнадзеіць. Так што настаўнікам я папрацаваў – хай сабе і літаратурным. І першая кніжка мая – "Вясёлы калаўрот" – прысвячалася дзецям.

– А вы самі ў каго вучыліся?

– У педвучылішчы мне пашчасціла быць вучнем выдатных настаўнікаў – Яўгена Замерфельда і Міхаіла Яўневіча (будучага прафесара ў сталічным Педінстытуце). Яны па-бацькоўску апекаваліся мною, дапамагалі. Нягледзячы на тое, што наша педвучылішча было рускамоўным, мы з захапленнем вывучалі родную мову і літаратуру – дзякуючы якраз Замерфельду і Яўневічу. Наладжваліся цікавыя сустрэчы, помню, выступалі ў нас Іван Шамякін і Мікола Аўрамчык. Я тады ўпершыню жывых пісьменнікаў пабачыў. Потым ужо я іх запрашаў да супрацоўніцтва – у тую ж "Бярозку".

– Дык мы з вамі "падбярозавікі" – і я ў свой час працаваў у гэтым часопісе. Тама перажываю за яго лёс. Учора ў "саюздрукаўскай" краме пагартаў свежы нумар – наклад 530 асобнікаў…

– Што значыць – уплыў на школу місэрны. Раней на "Бярозку" падлеткі ахвотна падпісваліся, тады ўвогуле наклады былі вялікія. Скажам, той жа "Піянер Беларусі" меў тысяч сто. Прычым у яго быў рускамоўны канкурэнт – газета "Зорька", якая ішла на ўвесь Савецкі Саюз і нават у Балгарыю. Дык улада пільнавала, каб наклад "Зорькі" не перавышаў наклад "Піянера Беларусі". Такая была мудрая палітыка "партыі і ўрада". А дзе мудрасць у дзеяннях сённяшняй улады? Усё пушчана на самацёк – як хочаце, так і выплывайце. А як тут выплывеш у нашай моўнай сітуацыі? Яна ж проста катастрафічная. І пра гэта трэба ва ўсе званы званіць!

«Беларуская мова – аснова дзяржавы? Дык умацуйце гэтую аснову!»

– Нядаўна дзяржсакратар Савета бяспекі Станіслаў Засъ агучыў новыя падыходы ўлады ў галіне інфармацыйнай бяспекі: «Калі мы гаворым пра абарону сваёй ідэнтычнасці, то павінны культываваць адну з яе асноў – беларускую мову, рабіць яе больш папулярнай. Гэты шлях трэба прайсці, каб мы ўмацаваліся як нацыя і як народ». Даўно падобных заяў не гучала з вуснаў чыноўнікаў такога рангу.

– Заява своечасовая і правільная. Але яна павінна падмацоўвацца канкрэтнымі дзеяннямі. Пачаць неабходна з дзіцячага садка, са школы. Паглядзіце, што робіцца на нашым тэлебачанні. Многія тэлеперадачы сёння прасто супярэчаць таму, што сказаў Засъ. Добра, што ён абазначыў сваю пазіцыю, а чаму маўчыць міністр адукацыі? Ці ён не збіраецца выконваць дакумент, падпісаны кіраўніком краіны? Беларуская мова – аснова дзяржавы? Дык умацуйце гэтую аснову! На футбол і хакей грошы знайшліся, хай жа знойдуцца і на падтрымку мовы. І на падтрымку літаратуры на гэтай мове.

– Як казала адна маладзіца: і даюся, і баюся… З дзяржаўнай падтрымкай прыйдзе і дзяржаўны кантроль, які накіне на літаратуру вуздэчку цэнзуры, як тое было за савецкім часам.

– Дзяржаўная падтрымка можа быць рознай. Наўрад ці мы вернемся да старой практыкі ў стасунках паміж пісьменнікамі і дзяржавай. Але яна можа ствараць спрыяльныя ўмовы для мецэнатаў, каб людзі заможныя дапамагалі літаратуры і ў цэлым культуры. Мы прывыклі ўжо да абвестак у інтэрнэце пра збіранне міласціны: падайце на кніжку! Але не кожны пісьменнік пойдзе на такое, на маю думку, прыніжэнне. Скажам, я ніколі не буду з шапкай стаяць і прасіць. Гэта сусветная практыка – сур'ёзнае мастацтва павінна падтрымлівацца. Тая ж класічная сімфанічная музыка сама па сабе не выжыла б.



«Наша даўняя звычка: махаць кулакамі пасля бою»

– У часы вашага старшынявання Саюз пісьменнікаў (тады адзіны) страціў Дом літаратара – цэнтр нацыянальнай культуры на працягу дзесяцігоддзяў. Сёння гэты вялізны будынак на Фрунзе, 5 належыць Кіраўніцтву справаў прэзідэнта, пераважна здаецца ў арэнду. Ці ўсё было вамі зроблена, каб адстаяць сваю маёмасць?

– Дом літаратара Машэраў падарыў пісьменнікам, але юрыдычна гэта нікім не было задакументавана. Што і абярнулася для нас бядой. Але мы тады (1997–1998 гады) зрабілі ўсё, што ад нас залежала. Пісалі чалабітныя пісьмы, хадзілі па ўстановах, арганізавалі пікет, прайшлі Гаспадарчы і Вярхоўны суды. Помню, як суддзя па-сяброўску сказаў нашай адвакатцы Веры Страмкоўскай (яны разам вучыліся): «Дарэмна ты ўзялася за гэтую справу. Дарэмна пісьменнікі размахаліся крыламі. Усё даўным-даўно вырашана». А вырашана было на самым версе – такія і такія будынкі передаць Упраўленню спраў прэзідэнта. І ўсё. Што можна было зрабіць?

– Мне прыгадалася тагачасная эпіграма: «Фрунзе, 5 не аддавацьрамма, / не ляжаць на пузе, / а за Фрунзе ваяваць, / як таварыш Фрунзе». Помніцца, пісьменнікі пікет уяўлялі з сябе вартае жалю відовішча – яго ўдзельнікі, па-мойму, самі не верылі, што нечага дамогуцца.

– Ляжачы на печы ці седзячы за кухонным сталом, усе смелыя. А вось як спатрэбілася сабрацца ля Дома літаратара, дык нават той, хто абяцаў касцямі легчы на ганку, не з'явіўся. Мне на тым пікеце, помню, згадалася, як кавалеры з маёй роднай вёскі Мачулішча (гэта Крупскі раён) калісьці падаліся на танцы ў суседнюю вёску Прудок – падкарагодзіць тамтэйшых прыгажунь. Дык нашых адтуль так турнулі, што ўцякалі па заснежаным балоце – дарога была перакрыта. І вось адзін з мачулінцаў ускочыў дома на печ, схапіў качалку для бялізны і крыкнуў: «От цяпер я паказаў бы тым прудчанам!» Так што гэта наша даўняя звычка: махаць кулакамі пасля бою.

– Насілед за Домам літаратара Саюз пісьменнікаў страціў і свае перыядычныя выданні. Дакладней, іх улада перадала новастворанаму саюзу пад кіраўніцтвам Мікалая Чаргінца. Помніцца, як некалькі гадоў таму тыднёвік «Літаратура і мастацтва» надрукаваў вялікі артыкул пра вас, яўна запрашаючы да супрацоўніцтва. Як вы да гэтага паставіліся і што параіце сваім калегам з незалежнага Саюза беларускіх пісьменнікаў?

– Я не лічу тую публікацыю запрашэннем да супрацоўніцтва і нічога нікому не раю. Кожны выбірае сваю пазіцыю сам. Я лічу так: і «ЛіМ», і «Полымя», і «Маладосць» створаны не чаргінцоўскім саюзам, ён іх проста прысвоіў. Гэтыя выданні мы павінны расцэньваць як агульныя трыбуны. І калі б у тым жа «ЛіМе» друкаваўся Анатоль Вярцінскі, Віктар Казько і Уладзімір Някляеў, то мы мелі б больш поўнае уяўленне пра сучасную нашу літаратуру. Цяпер жа ў чытача складваецца аднабокае ўражанне. Паўтаруся: трэба названыя выданні ўдасканальць для ўсіх пісьменнікаў.

– Хто з пісьменнікаў для вас прыклад існавання ў грамадскім жыцці і літаратуры?

– Янка Брыль. Я яго вельмі шанаваў і як пісьменніка, і як чалавека.

«Кавалёнак быў бы годным прэзідэнтам Беларусі»

– Ваша кніга «Нача» сапраўды пабывала ў космасе? Гэта не легенда?

– Факт гэты засведчаны ў касмічным рэпартажы і газеце «Известия». Помню тэлекадры, дзе Кавалёнак проста на арбіце чытае вершы з «Начы» сваёму касмічнаму спадарожніку Іванчэнкаву, тлумачыць незразумелыя словы.

– А дзе сёння знаходзіцца тая «касмічная» кніга?

– Як падарыў мне сам Уладзімір Васільевіч, ён здаў яе ў маскоўскі Музей Кастрычніцкай рэвалюцыі.

– Шкада. Яе месца ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры. У той кнізе былі вершы і на касмічную тэму, ледзь не ўсе планеты Сонечнай сістэмы згадваліся: «Зямля, Венера, Марс, Сатурн, Юпітэр – / вагоны з Сонцам счэпленыя вечна». Відаць, гэтым і зачапілі вы земляка-касманаўта за жывое?

– Зачапіла яго назва кнігі. Кавалёнак мне расказваў, як падчас першага палёту не адбылася запраграмаваная стыкоўка карабля са станцыяй, і касманаўты хутка прызямліліся. І Кавалёнак прыехаў у родную вёску Белае, што на Крупшчыне, прыехаў адзін, без суправаджальных картэжаў. І, калі ў кнігарні ўбачыў кнігу пад назвай «Нача», адразу купіў і ўзяў з сабой у Зорны гарадок. А перад другім палётам ён папрасіў прыслаць «Начу» на арбіту. На станцыю «Саюз-6» грузавіком «Прагрэс» яе і даставілі. А Іванчэнкаву, дарэчы, даставілі гітару.

– Рыгор Барадулін тады іранізаваў: «А Зуёнак рыфму чуў з пялёнак. / І зямляк Зуёнкаў Кавалёнак / лётаў доўга ў космасе, няйначай, / зачытаўся Васілёвай «Начай». А як адрэагавала на палёт вашай кнігі ў космас улада?

– Ніякага ўзрушэння на ўладу гэты факт не зрабіў.

– Кніга «Нача» не атрымала Дзяржаўную прэмію?

– Не. Да Дзяржаўнай прэміі мне яшчэ далекавата было.

– У вясёлы паэма «Прыцягненне», прысвечаная Кавалёнку. А ці давялося вам бліжэй пазнаёміцца з жыццём касманаўтаў?

– Давялося. Быў я ў Зорным гарадку, сустракаўся з касманаўтамі, меў некалькі кароткіх гутарак з Гагарыным. Што мяне здзівіла, дык гэта яго натуральнасць і адкрытасць. Памятаю, стаім на ходніку з Гагарыным, гаворым, а прахожыя літаральна накідваюцца на яго з пытаннямі. Маладзіцы абдымаюцца з ім, а ён для ўсіх знаходзіць добрае слова, усім усміхаецца сваёй чароўнай усмешкай.

– Кавалёнак, будучы дэпутатам Вярхоўнага Савета 12-га склікання, у 1991 годзе ўнёс у залу пасяджэнняў бел-чырвона-белы сцяг. Ці тым чалавеку была даручана гэтая ганаровая місія? Касманаўт навал у Беларусі на той час не жыў.

– Кавалёнак заслужыў на такую місію. Ён вераў у ідэю незалежнай Беларусі, тут я абсалютна перакананы. І народ вельмі Кавалёнка любіў, я гэта неадпойчы бачыў на сваё вочы. Думаю, калі б Кавалёнка абралі прэзідэнтам Беларусі, гэта быў бы годны выбар.

– А хіба ў яго былі такія амбіцыі?

– Публічна пра іх не гаварылася. Але настрой такія ў народзе хадзілі, я на сваіх землякох ведаю. Думаю, што тагачасная беларуская наменклатура пабачыла ў ім сур'ёзнага саперніка і пацікенькі пачала адрухаць ад актыўнай дзейнасці. А Кавалёнак – выдатны чалавек і беларус. Толькі адзін штрышок дадам. Неяк я атрымаў ад яго фатаграфію з надпісам: «Васілю Зуёнку з борта касмічнага комплексу са шчырай падзякай за вершы». І на адвароце – прыпіска: «Я мару, што ў Зялёнай пушчы мы не адзін раз з табой, зямеля, шашлычкі падсмажым». Мы з Кавалёнкам праблемаў моўных не мелі, ён часам па-беларуску не горш за мяне.

«Галоўнае сямейнае правіла – праяўляць сялянскае цярпенне»

– У вашай кватэры – з дзясятак вялікіх акварыумаў, дзе безліч самых розных рыбак. А ў спецыяльных шкляных кантэйнерах жывуць змеі і нават пітон з Новай Гвінеі. Як вы даяце рады ўсёй гэтай жыўнасці?

– Гэта гаспадарка сына Сяргея, ён па спецыяльнасці біёлаг. Неяк у нас жыў вуж – у шкляной скрыначцы. Надакучыла яму сядзець, ён падняў галавой накрыўку, вылез і на балконе перапоўз да суседзяў. Ніхто гэтага не заўважыў. І раптам суседка на ўвесь дом лямантуе! Я прыбег, а яна паказвае – у кошыку з бульбай змяя! А сама аж на стол ускочыла. Я супакоіў суседку, узяў вужа за шкірку і вынес. Гэта сынава захапленне. Ён яшчэ фотасдымкамі птушак займаецца. Шмат ездзіць па Беларусі, вышукае то сыча ў гняздзе, то саву ў дупле. Мы з Сяргеем задумалі кнігу выдаць – яго здымкі, мае вершаваныя подпісы.

– Ведаю, што вы з жонкай Валянцінай пражылі шмат гадоў, адзначылі залатое вяселле. А дзе пазнаёміліся?

– Мы на філфаку БДУ разам вучыліся, жылі ў студэнцкім інтэрнаце на адным калідоры.

– А дзень шлюбу памятаеце?

– 7 жніўня 1959 года. Сёлета будзе 60 гадоў.

– Ого, дыяментавае вяселле! А падзяліцеся досведам, што робіць сям'ю такой трывалай?

– Галоўнае сямейнае правіла – праяўляць сялянскае цярпенне ў жыццёвых сітуацыях. Дарней дзе ты бачыў, каб селянін кідаў жонку? Ён мог трохі да суседкі пазаляцаца, усякае ў жыцці бывае. Але хаты і сям'і сваёй трымаўся. Ніколі селянін *у разбрыкі* не ішоў, сям'ю не кідаў.

– Дык гэта ў сялян так прынята было. А вы з жонкай – інтэлігенты, хай сабе і ў першым пакаленні.

– Мы засталіся сялянамі, хоць і жывём у сталіцы.

– Што значыць засталіся? Вы за плуг можаце стаць ці касой на поплаве памахаць?

– Лёгка! І з плугам, і з касой яшчэ спраўлюся. У мяне на лецішчы ёсць дзве касы. Я і адбіць іх магу, хоць гэта далікатная справа. Трэба ўмець *лопавак* не нагнаць. А вось лапці плесці я не навучыўся.

– У хіба ў вашы часы вяскоўцы яшчэ ў лапцях хадзілі?

– У нас на Крупшчыне лапці былі ва ўжытку да канца 1950-х гадоў. Бо лепшага абутку для сенакосу дзе-небудзь у забалочаным месцы не знайсці. Нагу падняў – вада і выцекла. Лапці насілі, пакуль не з'явіліся гумовыя боты. А ў нас яшчэ стараверы жылі, што перабраліся з Расіі, іх цэлыя вёскі былі. Скажам, у нашым баку вёска Ваўкавыск – цалкам старавераская. Дык стараверы таксама лапці плялі, але нашы лічыліся лепшай якасці.

– А ці абеларушваліся вашы старaверы?

– Яны стараліся трымацца свайго, шлюбаваліся спачатку толькі са сваімі. А нас, мясцовых, дражнілі: «Ах вы, гады-мужыкі – подколодные жуки!». Мова ў іх была падкрэслена руская, і пісаліся яны рускімі, з-за чаго пачатковая школа ў нас да вайны была рускамоўнай. А ў вайну немцы панішчылі яўрэяў, і пайшлі чуткі, што возьмуцца за старавераў. Дык яны ўсе адразу ж перапрасіліся на беларусаў! І школа пасля вайны стала беларускай.

«Каб узрушыць увесь народ»

– Калісьці Уладзімір Караткевіч пра раман Дастаеўскага «Браты Карамазавы» сказаў: «Гэта вяршыня, на якой дух займае». Адна з вашых кніг пабывала вельмі высока, вышэй за ўсе вяршыні Беларусі. А якія творы ў беларускай літаратуры вы лічыце самымі вяршынымі?

– Найперш назаву «Новую зямлю» Якуба Коласа, гэта твор непераўздызены. Потым – «Знак бяды» Васіля Быкава. Памятаю, прачытаўшы яго, я адразу патэлефанаваў Васілю Уладзіміравічу і сказаў, што нарэшце ён праявіўся як сапраўды народны пісьменнік, раскрыў характар беларуса. Гэта было для мяне вялікай радасцю. Падобную радасць я адчуў, прачытаўшы «Людзей на балоце» Івана Мележа і «Плач перапёлкі» Івана Чыгрынава. Беларускі паэт на ўвесь свет – Максім Багдановіч. Ён змог міфалогію спалучыць з філасофіяй, падсвядоўшы іх найвялікшым паэтычным майстэрствам. Скажам, яго санет «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі» – гэта проста пушкінскі ўзровень. Моцна ўскалыхнуў народ сваімі гістарычнымі творамі Уладзімір Караткевіч. Разумееш, Колас і Купала – гэта як іконы-абразы на покуці. На іх перахрысціцца і пайшоў. А Караткевіч ускалыхнуў. І ў Беларусі сёння менавіта такіх твораў не хапае – каб узрушыць увесь народ.

СІТУАЦЫЯ

«6,5 тысячи рублей перечислили на лечение врачу-травматологу…»

Как врачи помогают своим коллегам в непростых ситуациях

В 2017 году в Бобруйске случилась резонансная история, точка в которой была поставлена лишь недавно.

30 ноября 2017 года в Бобруйской центральной больнице 23-летняя врач-интерн, делая укол анестезии, проколола легкое 24-летнему пациенту, развился пневмоторакс – проникновение воздуха в легкие. Мать парня, которому, к слову, своевременно была оказана помощь и который потом благополучно выписался из больницы, была недовольна действиями вчерашней выпускницы медвуза, посчитала, что осложнение случилось исключительно по ее вине, и, пока сын находился на лечении, обратилась с заявлением в Следственный комитет.

Проверка по ее заявлению длилась полгода, была проведена, как заявляли следователи, *«сложная экспертиза»*, которая обнаружила, что *«предпосылкой тяжких телесных повреждений стало ненадлежащее исполнение анестезиологом своих профессиональных обязанностей»*. В мае прошлого года в отношении врача-интерна возбудили уголовное дело, ей грозило до двух лет лишения свободы.

«Это был громкий случай, – рассказывает сегодня Ольга Светлицкая, врач-реаниматолог Городской клинической больницы скорой медицинской помощи Минска. – *Дело бобруйского интерна нашумело на всю страну, оно длилось больше года. Там последовательно работали несколько врачебных комиссий, выводы их были идентичны. Интерн выполняла стандартную манипуляцию по обезболиванию, при которой есть определенный процент случаев осложнений в виде пневмоторакса. И хотя это тяжкое телесное повреждение, оно является часто встречаемым. Во всем мире фиксируется 2–3 процента таких осложнений – в Великобритании, и в США, и в других странах. Вины врача там не было! И это было написано в заключениях. Они предоставлялись в следственные органы, в Министерство здравоохранения... Но неудовлетворенные заявители снова писали жалобы, и снова формировалась комиссия, люди отрывались от работы. В итоге дело бобруйского интерна было закрыто на основании отсутствия состава преступления»*.

Случилось это только в феврале 2019 года. Несмотря на пережитое потрясение, молодой доктор приняла решение остаться в профессии.

Ольга Светлицкая рассказывает, что этот случай настолько потряс медицинское сообщество, что по всей стране был объявлен сбор средств для оказания помощи молодому коллеге.

«В ординаторских лежали конверты «В поддержку бобруйского интерна», куда складывались пожертвования, – рассказывает врач-реаниматолог. – *Мы смогли нанять ей хорошего адвоката. И я, честно скажу, горжусь этим. Мы смогли собрать приличную сумму, часть денег осталась, и мы приняли решение 6,5 тысячи рублей перечислить на лечение врача-травматолога Владимира Чуксина, который страдает БАС* (боковой амиотрофический склероз – неизлечимая болезнь центральной нервной системы, при которой слабеют мышцы, человек перестает ходить и даже глотать. – **Ред.**). *Он уже не может передвигаться самостоятельно, был вынужден уйти из профессии»*.

По словам Ольги Светлицкой, история бобруйского интерна своего рода показательна еще и потому, что является ярким примером того, насколько в Беларуси не защищены медики.

«В нашей службе анестезиологов мы пытаемся создать свою ячейку юридической помощи, – подчеркивает специалист. – *Врач сегодня не защищен. Только вдумайтесь: в законодательстве нет определения «медицинская ошибка», «осложнение». Мы говорим об этом не первый год. Но пока ничего не меняется…»*

Мария ЭЙСМОНТ.

ЧУЛІ?

У музей – онлайн

Аказваецца, усе дзяржаўныя музеі абласнога ўзроўню, якія ўваходзяць у сістэму Міністэрства культуры, да 1 чэрвеня павінны прапанаваць гасцям віртуальныя туры па сваіх экспазіцыях.

Віртуальныя туры з'явяцца ў 17 музеях Гродзенскай вобласці. Фармат тураў вызначыць персанал музеяў. Гэта могуць быць відэапрэзентацыі, 3D-туры, віртуальныя экскурсіі, якія будуць прадстаўляць экспазіцыі цалкам альбо часткова. Галоўнае – зацікавіць наведвальнікаў і зрабіць рэкламу музеям.

Некаторыя музеі вобласці ўжо прапаноўваюць наведвальнікам віртуальныя падарожжы. Так, да прыкладу, з 2016 года на канале youtube можна пабачыць 8-хвілінны фільм пра экспазіцыю музея-сядзібы **Міхала Клеафаса Агінскага** *(на фота)* ў Залессі і адчуць яго атмасферу.

Ужо зараз можна накіравацца ў 3D-падарожжа па невялікім Музеі вавёркі ў Вялікай Бераставіцы альбо паглядзець відэапрэзентацыю музея **Адама Міцкевіча** ў Навагрудку. А на сайце замкавага комплексу «Мір» ужо некалькі год выкладзены фільм пра сам замак, а таксама 3D-тур па ягонай экспазіцыі. Як заўважаюць работнікі замкавага комплексу, 3D-тур дазваляе заглянуць у большасць адкрытых для турыстаў залаў і разгледзець экспанаты, ляпніну на столях, разьбу на мэблі і іншыя дэталі, але гэта ні ў якім разе не можа замяніць непасрэднае наведванне самога замка.

Безумоўна, асабістае падарожжа па музеі ўражвае куды больш за віртуальнае.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

НЕ ПРОПУСТИТЕ!

Валентин ЕЛИЗАРЬЕВ:
«Я чуть не разбился!»

24 апреля на сцене Большого театра Беларуси – обновленная «Кармен» Валентина Елизарьева.

Всех, кто приобрел билеты на «Кармен-сюиту», приглашают прийти пораньше: *«Вас ждет автограф-сессия с исполнительницами заглавных партий – Татьяной Ершовой, Татьяной Шеметовец, Ольгой Гайко, Мариной Вежновец, Ириной Еромкиной, а также удивительная встреча с Валентином Елизарьевым. Парадные двери театра будут открыты с 17.45».*



«Кармен-сюита» – первый спектакль, который поставил на сцене Большого Валентин Елизарьев, теперь – художественный руководитель театра, народный артист СССР и Беларуси. В далеком 1974-м после премьеры «Кармен-сюиты» артисты белорусского Большого качали на руках Валентина Николаевича и подбрасывали его в воздух! *«Я чуть не разбился!..»* – смеется Елизарьев. Этот балет гастролировал по всему миру.

«Я искал свой сюжет. И нашел, – говорит Елизарьев о своей «Кармен». – *Но, как ни странно, не у французского писателя Мериме – у русского поэта Блока. Его цикл стихотворений «Кармен» и лег в основу постановки в Минске. Я созвонился с композитором – Родионом Щедриным, поделился своей идеей, и он с удовольствием ее подхватил, потому что это действительно иное видение образа Кармен. Я не пытался пересказать новеллу Мериме, я хотел передать через хореографию три полета Кармен, которые есть у Блока, – навстречу жизни, любви и смерти…»*

Вера ВИР.

ЗАКУЛІССЕ

Харланчук цяпер з «Зоркай»

Артыст і рэжысёр Купалаўскага тэатра Павел Харланчук-Южакоў атрымаў «Хрустальную зорку».

Беларускі саюз тэатральных дзеячаў днямі раздаў узнагароды.



«Хрустальную Паўлінку» атрымаў заслужаны артыст Беларусі **Аляксандр Парфяновіч,** які больш за 40 гадоў працуе ў Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

«Хрустальнага анёла» ўручылі актрысе Гомельскага тэатра лялек **Тамары Гарачавай.**

«Хрустальную кветку» за лепшы дэбют атрымала **Вераніка Баранава**, актрыса Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра.

Паўла Харланчука ўзнагародзілі «Хрустальнай зоркай» за «вялікі ўклад у тэатральнае мастацтва Беларусі і шматгадовую творчую працу».

Галіна РУТ.

ПАМЯТЬ

Дмитрий Прокопенко:
«В честь отца планируем установить два памятника»

Тридцать лет назад не стало известного белорусского футболиста Александра Прокопенко.

«Прокоп для людей вообще был как народный герой, – говорит бывший игрок минского «Динамо» **Юрий Пудышев**. – *В нашей команде было много великолепных футболистов, но единственный Народный – это Саша Прокопенко. Талант от Бога! Я все время это говорил и говорить буду».*

Болельщики до сих пор вспоминают игру этого действительно талантливого футболиста, но в свое время судьба распорядилась так, что Александр Прокопенко ушел из жизни рано – он трагически погиб в 35 лет.

«Я тогда приболела, сын Димка был на каникулах у моих родителей, – рассказала «Народной Воле» Наталья – супруга Александра Прокопенко. – *Вечером выпила таблетки, утром проснулась – мужа дома нет. И телефонный звонок: «Саша умер». Я сразу позвонила Сашиным родителям… Пошла в «Динамо», затем отправилась в морг 9-й больницы. Помнится, иду и открываю одну дверь, вторую, третью… Лежит Саша. Привезли его вечером, Ольга Савельевна, мама Саши, сразу на колени…*

Через три года похоронили и Ольгу Савельевну, она тоже ушла очень рано – в 65 лет. Чуть позже умерли отец и два брата мужа. Так что сейчас все лежат на одном кладбище».

Сейчас сын и жена Александра Прокопенко живут в основном в США, но нередко приезжают в Минск.

В конце прошлого года состоялась презентация книги «Александр Прокопенко. Народный футболист». Авторы издания – сын футболиста Дмитрий Прокопенко и журналист Сергей Лисичкин.

– Знаю, с вашей стороны есть предложение поставить два памятника Александру Прокопенко – на его родине в Бобруйске и в Минске…

– Бобруйский проект сейчас находится в стадии рассмотрения, – сказал мне **Дмитрий Прокопенко,** сын легендарного футболиста. – А вот в Минске еще нужно ожидать разрешения на место установки памятника. Хотелось бы, конечно, чтобы он находился на стадионе «Динамо», где более десяти лет играл отец, но, повторюсь, это будут решать городские власти.

– Если городские власти не разрешат установить памятник на стадионе «Динамо», то какие еще варианты будете рассматривать?

– В Минске будет построен и Национальный стадион, поэтому этот вариант тоже не исключаем. Но, повторюсь, пока все это находится на стадии согласования.

Алесь СИВЫЙ.


Зьміцер Пракапенка (Courtesy Photo)

ЛЮДЗІ І ЗВЯРЫ

Ваўчатнік

Як клімавіцкі паляўнічы Пётр ПРУДНІКАЎ знішчыў пасля вайны тысячу ваўкоў

Не за царом Гарохам, але даўненька ў рэдакцыю «Сельской газеты» паляшук з Петрыкаўскага раёна прыслаў невялічкую заметку пра воўка, які напаў на яго ў глухім лесе. Чалавек перамог лютага звера. «Прыроду ў рэдакцыі вяла Ліля Шуман. Яна напісала аўтару, што, загубіўшы воўка, ён паступіў неабачліва: маўляў, ваўкі прыносяць карысць, яны выконваюць санітарную функцыю. Праз некалькі дзён прыйшоў адказ ад аўтара, абуранага ў сваіх лепшых пачуццях: «Дык што, мне трэба было пачакаць, пакуль воўк выканае гэту самую хвункцыю?»

Уся рэдакцыя смяялася. «Санітараў трэба берагчы, – жартавалі з Лілі калегі, – без іх з хвункцыяй непярэліўкі…» Адным словам, і смех і грэх.

Пасля вайны не леснікі былі гаспадарамі лесу, а зубастыя, злыя звяры. Яны нападалі на калгасныя фермы, шасталі па вёсках: душылі прама на пашы авечак, цялят, здаралася, нападалі на людзей. Уварвецца ў авечую атару ці гурт кароў воўк і, п’янеючы ад крыві, душыць жывёлу.

Ва Ушацкім раёне адзін «мудры» старшыня калгаса, каб сэканоміць на пастухах, перавёз лодкамі на даволі вялікі азёрны востраў ажно дзве сотні авечак. Ён выхваляўся, што там мора травы: авечкі будуць тлусцець не па днях, а па гадзінах. «Праз месяц праведаю сваю атару, а так і трывожыць не варта. Да бліжэйшага берага не менш за кіламетр, не ўцякуць», – паціраў рукі гаспадарнік.

Пра беражлівага кіраўніка праўлення надрукавала заметку раённая газета, прайшла інфармацыя па абласным і нават рэспубліканскім радыё. У адначассе таварыш стаў знакамітым. Праз тры тыдні, прыхапіўшы з сабой карэспандэнтаў, галоўнага заатэхніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі, ён павёз дарагіх гасцей на цуд-востраў. Прыплылі, ступілі на бераг. Страшны смурод. Безліч мух. Ніводнай жывой авечкі. Мора крыві. Па слядах вызначылі: забойца – адзін-адзіны (!) воўк. Ён даплыў да вострава і перарэзаў усіх бедных жывёл.

– Але як жа гэты паганы зваруга пачуў з берага авечак? – здзіўляўся старшыня. Ён не ведаў, што ў воўка выдатны нюх, чуткі слых і востры зрок. Дзякуючы гэтым якасцям, мацёры звер пазбягае небяспекі, знаходзіць яду, даганяе дзічыну, рэдка трапляе ў пастку. Пры ледзь прыкметным сустрэчным ветры воўк улоўлівае нават нязначны пах. Слых у воўка выключны. Здагадацца, што на востраве шмат мяса, зверу было лягчэй лёгкага, а вось пусціцца ў даволі далёкае плаванне прымусіў, хутчэй за ўсё, голад, які, як лічыў Рабінзон Круза, прыручае нават льва.

У старажытнабеларускай мове авечак называлі шуткамі. І сёння пастухі, збіраючы да кучы атару, гучна выкрыкваюць: «Шуткі, шуткі, шуткі!..» Злую «шутку» сыграў воўк з ушацкім старшынёй. Ён да скону выплачваў нанесеную гаспадарцы матэрыяльную шкоду, быў звольнены з пасады. Яшчэ пашанцавала: маглі ў той суровы час адправіць у сібірскую тайгу пасвіць пясцоў.

Дзесьці з шасцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя і па сённяшні дзень наш брат пісьменнік і журналіст «аблагароджваюць» воўка: маўляў, выконвае санітарную функцыю, без яго апусцее лес, перамруць ці не ўсе ласі, алені, казулі, зайцы. Знакаміты рускі паэт і празаік Уладзімір Салаухін напісаў у свой час верш «Волки». Мы, студэнты, перапісвалі яго ў сшыткі, завучвалі на памяць: *«Мы – волки, и нас по сравненью с собаками мало…»* У канцы верша аўтар асуджаў усю «псовую братию»: «Вы в сущности волки, но вы изменили породе…». Падтэкст да прымітыўнасці просты: мала гордых людзей-ваўкоў, якія не дагаджаюць начальству.

Пра воўка памоўка

Не за то волка бьют, что сер, а за то, что овцу съел.
Руская прымаўка

Паў-Еўропы прайшоў франтавымі дарогамі Пётр Піліпавіч Пруднікаў. Фарсіраваў малыя і вялікія рэкі, мёрз у акопах. Адступаў, наступаў, хадзіў у штыкавую атаку. Сярод дарог, сярод трывог гінулі баявыя таварышы, а клімавіцкага хлопца старая з касой абходзіла.

– За прыгажосць цябе палюбіла, – жартавалі сябры. – Дзіва што: высокі, статны, глаз, як алмаз!

Быў салдат Пруднікаў плячысты, рухомы, наўздзіў трывалы. Ён лёгка адольваў доўгія марш-кідкі, падносіў за таварышаў цяжкія кулямёты, скрынкі з патронамі…

Пасля марш-кідкоў салдаты падалі як забітыя, сплюшчвалі вочы, ледзь дакрануўшыся да зямлі. Каго першым айцы-камандзіры ставілі ў каравул? Ну канешне, Пятра!

Вярнуўся Пруднікаў у родную вёску пры ордэнах і медалях. Сябры агітавалі падацца ў паляўнічыя, надта шмат ваўкоў развялося.

«Не ўжо! – не згаджаўся Пётр, – за вайну настраляўся».

Дома не знайшлося работы па душы, і Пруднікаў уладкаваўся слесарам пры Клімавіцкім камбінаце будматэрыялаў. Усё было б добра, сваю справу Пётр ведаў, але надта ўжо няблізкі шлях да сваёй вёскі: зімой снегу па пояс, без лыжаў і двух кіламетраў не адолееш, ды яшчэ турбавалі ваўкі. Развялося іх мноства. Бяжыць Пётр на лыжах, а за ім воўчая зграя. І зусім блізка не падыходзяць, і далёка не адпускаюць. А ранняй вясной асабліва нахабны воўк нярэдка забягае наперад: не зрушыцца з месца, пакуль не абыдзеш яго.

«Відаць, і праўда давядзецца запісвацца ў паляўнічыя», – вырашыў аднойчы Пётр Піліпавіч.

Даведка

Воўк у сваёй лютасці страшны звер. Рэжа хатніх жывёл, птушак, душыць сабак. Ён наносіць непапраўныя страты дзікім звярам і птушкам. Страты паляўнічым гаспадаркам прыносіць у шмат разоў большыя, чым жывёлаводам. Дзікі, ласі, казулі, калі і вырываюцца са страшных зубоў, то гінуць пасля ад ран. Па марозным снезе воўк бяжыць, як па асфальце, не правальваецца, а цяжкі лось у снезе па калена, уцякаючы, з кожным метрам слабее, становіцца лёгкай здабычай зграі. Воўк з’ядае за год да дзвюх тон мяса.

У 1982 годзе на воўчы «стол» у Беларусі трапілі дзясяткі коней, больш за тысячу кароў і цялят, каля пяцісот авечак. Толькі ў Магілёўскай вобласці, дзе аб’явіў вайну ненажэрнаму зверу Пруднікаў, ваўкі знішчылі каля пяцісот жывёл. І ўявіць цяжка, колькі яны нанеслі шкоды адразу пасля вайны, калі іх было тысячы. Народ сядзеў на нішчымніцы, а звяр’ё спраўляла крывавы баль. Хто-хто, а ваўкі свае санітрныя «хвункцыі» выконвалі спраўна, па-стаханаўску.

Мыслівы №1

Сінонім назоўніка «паляўнічы» ў нас, як і ва Украіне, – мыслівы. Хутка наш Пруднікаў стаў мыслівым №1. За час вайны па самых прыблізных падліках пагалоўе ваўкоў на акупаванай тэрыторыі нашай краіны вырасла ўтрая. Па вёсках паўзлі самыя неверагодныя чуткі. Казалі, быццам немцы, адступаючы, спецыяльна пакідалі сваіх аўчарак, а тыя параднiліся з ваўкамі. Агульнае патомства ўжо не баіцца ні людзей, ні агню.

Было прынята рашэнне: за кожнага знішчанага воўка (і нават ваўчаня) плаціць па дзвесце-трыста рублёў. І гэта ў той час, калі рабочы за месяц атрымліваў ледзь восем соцень, а калгаснік – і зусім нічога.

Стварaліся спецыяльныя брыгады па знішчэнні ваўкоў. Забіваць іх дазвалялася любымі сродкамі ў любую пару года. Меркавалася за два-тры гады звесці пражэрлівага звера.

Ужо за першы год палявання на воўка Пётр Піліпавіч Пруднікаў знішчыў дзясяткі драпежнікаў. Далей – болей. За выручаныя грошы купіў веласіпед, а там і матацыкл. У любы час года калясіў па бездарожжы, вышукваючы ваўчыныя логавы. Мыслівага запрашалі ў іншыя раёны вобласці, дзе ён дзяліўся досведам. А колькасць зубастых трафеяў расла. Пра знакамітага паляўнічага загаварыла ўся рэспубліка. За другі год Пруднікаў знішчыў ваўкоў удвая больш, чым за першы. Пра яго пісалі рэспубліканскія і нават усесаюзныя газеты, да яго прыязджалі карэспандэнты радыё і тэлебачання. Ужо з Бранска і Смаленска тэлефанавалі кіраўнікі абласцей – прасілі камандзіраваць мыслівага Пруднікава для абмену вопытам. Абяцалі выслаць за ім у Клімавічы машыну, аплаціць «грозе волка» дарожныя выдаткі. Такое прозвішча прычапілася, як дзядоўнік, да Пруднікава з лёгкай рукі аднаго з усесаюзных карэспандэнтаў.

Неўзабаве і Масква зацікавілася Пятром Піліпавічам. У 1979 годзе беларускага паляўнічага запрасілі на ВДНГ СССР, дзе праходзіла канферэнцыя на тэму «Абмен вопытам рэгулявання колькасці ваўкоў у краіне».

Не вельмі спадабалася Пруднікаву тэма канферэнцыі. «Наіўныя людзі, якія бачылі ваўкоў хіба што ў заапарку, вырашылі, што колькасць шэрых разбойнікаў можна рэгуляваць», – дзівіўся Пётр Піліпавіч.

Стаіўшы дыханне, стараючыся не прапусціць ніводнага слова, лепшыя «ваўчатнікі» краіны слухалі рэкамендацыі беларускага мыслівага.

– Паляўнічы-ваўчатнік, – гаварыў з трыбуны Пруднікаў, – павінен мець моцнае здароўе, быць трывалым, настойлівым, смелым, добра арыентавацца ў лесе, ведаць звычкі звера, умець перайманць галасы самцоў і самак, добра распазнаваць іх сляды, ведаць тэрміны з’яўлення вывадкаў, верагодныя месцы логаваў; мець сяброў не толькі сярод мысліўых, але і пастухоў, вартаўнікоў фермаў, шафёраў аўтатранспарту. Няма хоць адной гэтай якасці ў паляўнічага-ваўчатніка – і яму месца на печы, а не ў лесе.

Далей Пётр Піліпавіч падзяліўся метадамі знішчэння ваўкоў. Гэта і пасткі з прынадай для маладых і пажылых, больш хітрых, звяроў, і даставанне з логава ваўчанят да двух месяцаў, і засады на дрэвах ля логаваў і жывёламогільнікаў, і паляванне са сцяжкамі…

Усхвалявана, падрабязна Пруднікаў распавядаў пра пошукі логава ў красавіку-маі. Гэта і апытанне мясцовых жыхароў, праслухоўванне начных завыванняў. Ваўчыца на ўсякі выпадак рыхтуе не адно логава, а некалькі, выводзіць малечу ў самым спрыяльным месцы: разбураных зямлянках, акопах, ярах, абавязкова непадалёку ад водных крыніц.

Назіраннямі беларуса зацікавіліся вучоныя Кіраўскага усесаюзнага навукова-даследчага інстытута паляўнічых гаспадарак і звераводства. Яму, зрэшты, было прысвоена званне ганаровага члена Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Больш за тысячу (!) ваўкоў знішчыў Пётр Піліпавіч Пруднікаў. Такога выніку не ўдалося дабіцца ніводнаму паляўнічаму Беларусі, Еўропы, а можа, і ўсяго свету. Скептыкі могуць сказаць: без прыпісак, пэўна, не абышлося. Але ёсць квітанцыі аб грашовых выплатах: улік быў строгі, і рэкорд Пруднікава можна заносіць у Кнігу рэкордаў Гінеса.

Даўно няма сярод нас Пятра Пруднікава, беларускага Сакалінага Вока, Гразы Воўка, а людзі памятаюць пра вялікага паляўнічага.



Васіль ШЫРКО.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
2 КРАСАВІКА 2019 г.

АСОБА

Сапраўдны Аўсяннікаў

«Тыдзень тэатра» ў Купалаўскім працягнецца да 9 красавіка. Напярэдадні сустрэча з галоўным рэжысёрам Пінігіным і нават адкрытыя чыткі новых п'ес. Адкрыў жа Тыдзень творчы вечар Генадзя Аўсяннікава, народнага артыста Беларусі, аднаго з двух народных артыстаў СССР, што засталіся ў Беларусі; другі – Валянцін Елізар'еў. Яны – наш нацыянальны здабытак. Але трэба ведаць Генадзя Сцяпанавіча, каб разумець: пафас – гэта не пра яго. Ён – лёгкі, падцягнуты, далікатны, у нязменным шыйным шаўковым кашнэ замест гальштука – выйшаў да гледачоў на круг Камернай сцэны і сказаў раптам без доўгіх прадмоў: «У бацькі было тры сыны: двое разумных, а трэці артыст».

Зала грымнула смехам.

Вось так заўсёды: галоўны весялун тэатра, а таксама старэйшы яго артыст – гэта ўсё ён, Генадзь Аўсяннікаў. Пасля такога ўступу было ясна, што вечар стане цёплай хатняй сустрэчай з любімым артыстам. Гэтую ноту Аўсяннікаў пратрымаў да апошняй хвіліны, ні разу не сфальшывіўшы, і, у прынцыпе, гэта яго галоўны артыстычны козыр: арганічнасць, прыродная натуральнасць.

Ну, а раз сабраліся сябры, то сустрэча была пабудавана на пытаннях і адказах. Але задавалі пытанні не гледачы, а калегі-артысты Генадзя Сцяпанавіча. Яны запісалі іх загадзя і з экрана строга, але з гумарам, як гэта ўмеюць купалаўцы, дапытвалі старэйшага таварыша, які служыць у іх тэатры ўжо 62-і год.

Пытанне ад Марыі Захарэвіч:

– Ці хочаш ты, Геначка, вярнуцца ў той час, калі насіў шынель?

– О, якія часы ўспомніла!.. Я даношваў шынель свайго аднакурсніка па тэатральным інстытуце Віці Тарасава. А потым насіў пінжакі Жэні Шабана – шырокія, з вялізнымі такімі плячыма па модзе пяцідзясятых. Без бацькоў я рос, без дамашняга догляду, вось і апранаў, што людзі давалі. Але навошта ўспамінаць мінулае? Не люблю. Гэта як пачынаць жыццё спачатку...

Пытанне ад Крысціны Дробыш:

– Дарагі Генадзь Сцяпанавіч, чаму, калі кахаеш, то падабаецца ўсё, нават старадарожскі самагон?

– Па-першае, для параўнання трэба ўсё пакаштаваць. А па-другое, як вядома, каханне злое. Я вось люблю тэатр, таму іграў усё: кіпячы чайнік, гарохавы суп і крокі Леніна. Ніхто крокі не іграў, а я іграў і ганаруся гэтым, на ўсіх сустрэчах успамінаю. Спектакль (не памятаю назвы) запісвалі на радыё. Павел Сцяпанавіч Малчанаў быў у ролі праўдадыра. У сцэнарыі было напісана: «Ленін імкліва падыходзіць да мікрафона». А ў Паўла Сцяпанавіча на нагах нешта накшталт макасін, мяккага абутку. Не чуваць яго крокаў! А ў мяне туфлі скураныя, абцасы добра падбітыя. Вось мне і прапанавалі сыграць крокі. Я хутка і гучна датупаў да мікрафона, а Малчанаў адразу ж усклікнуў: «Таварышы!..» А гарохавы суп? Што ж, калі суп густы ды на свіной рульцы, ён пыхае, не заўважалі? Вось і мне прыйшлося пыхаць...

Пытанне ад Рамана Падаляці:

– Дзядзька Гена, добры дзень! Віншую вас з Днём тэатра і хачу спытацца: як заваяваць сэрца дамы? І самае галоўнае – які верш ёй прачытаць на першым спатканні? Спадзяюся на ваша меркаванне.

І тут здарыўся сапраўдны «імправізохіс», як называе гэта сам народны артыст. Генадзь Аўсяннікаў, якому толькі што споўнілася 84 гады, раптам памаладзеў ледзь не на пяцьдзясят гадоў і прачытаў два вершы пра каханне: Аляксандра Пушкіна «Нет, не черкешенка она... » і Пімена Панчанкі «Лірычнае»: «Закацілася сонца за гай...» Ды як прачытаў! Парывіста, свежа, пяшчотна... І быццам анёл праляцеў над залай. Мне падумалася: «макаёнкаўскі тыпаж», як называлі Аўсяннікава крытыкі за яго бліскучыя вобразы мужыкоў-працякоў у п'есах Андрэя Макаёнка, усё ж такі не вычарпаў усіх фарбаў яго таленту – такім высокім рамантычным героем раптам паўстаў перад намі артыст!

Пытанне ад Івана Кушнерука:

– Паважаны дзядзька Гена, адкрыйце, калі ласка: колькі гадоў трэба адпрацаваць, каб перастаць хвалявацца перад кожным спектаклем?

– Усё жыццё трэба хвалявацца. А перастанеш толькі тады, калі апынешся на могілках. Таму што калі артыст не захвалюецца на сцэне, то глядач застанецца спакойны ў зале. І не адбудзецца той цуд, які называецца тэатрам.

Зноў пытанне ад Крысціны Дробыш (відаць, набалела):

– Як жыць і не памерці ў тэатры?

– Трэба памерці! Інакш гэта не тэатр, а «прадстаўленчаства».

Пытанне ад Мікалая Кучыца:

– Генадзь Сцяпанавіч, а колькі чарачак... гарбаты сёння, у Дзень тэатра, вы самі асіліце?

– Тры. І ўсе за тэатр – гэта мастацтва вечнае.

Вядома, не абышлося без акцёрскіх баек пра ролі, пра гастролі, пра сяброў-таварышаў. Артыст паказаў гледачам сцэну са спектакля «Святая прастата» А.Макаёнка, які калісьці ішоў у Купалаўскім, а таксама з будучага спектакля, які зараз яшчэ толькі рэпетыруецца ў тэатры рэжысёрам Аленай Ганум і выйдзе ў чэрвені – гэта будзе зноў знакаміты «Шляхціц Завальня» Яна Баршчэўскага. І мы з захапленнем пабачылі сапраўднага Аўсяннікава – таленавітага майстра беларускай сцэны!


Калі да артыста на сцэну выйшаў галоўны рэжысёр Мікалай Пінігін, ён сказаў, што Купалаўскі тэатр існуе толькі дзякуючы такім людзям, як народны артыст Генадзь Аўсяннікаў: «Вы з тых, хто трымае нас на беларускай зямлі, вы – карані Купалаўскага». Новы дырэктар Павел Латушка таксама падзякаваў артысту за вечар, хоць і зрабіў гэта не публічна, а ў ліку многіх гледачоў, якія з кветкамі сталі ў чаргу да Генадзя Сцяпанавіча.

Алена МАЛОЧКА.

ЧАСТНАЯ ЖИЗНЬ

Сергей Черечень уехал в Таиланд на курорт «баунти»

Глава Белорусской социал-демократической партии (Грамада) отдыхает на острове Самуи. Фотографии с отдыха на Тихом океане политик и бизнесмен выложил в социальных сетях.



«*Самуи – это белоснежные пляжи, кокосовые пальмы, удивительные скалы, острова и островки, безумные вечеринки полнолуния, водопады и, конечно же, вечное лето*, – так пишут про этот остров в интернете. – *Важным отличием Самуи от других курортов Таиланда является отсутствие больших волн на море круглый год. Да и сезон дождей на острове не так выражен, как на территории всего Таиланда. Это курорт «баунти», где можно бесконечно наслаждаться шикарными видами на девственную природу, голубое море и белый песок…*»

В качестве сувениров на Самуи можно купить натуральный жемчуг, натуральное кокосовое масло, которое производится на острове.

Сергей Черечень не скрывает: он любит путешествовать и несколько раз в году старается отвезти семью на море или океан.

Кстати, на Самуи в Таиланде сейчас отдыхает еще один бизнесмен – **Аркадий Израилевич** вместе с женой Маргаритой.

«*Ну и город, я вам скажу!* – поделилась своими впечатлениями от столицы Таиланда Бангкока Маргарита. – *Толпы людей. Везде пахнет едой, так как готовят ее везде и продают также везде! Шум от тук-туков и мотороллеров невероятный. Воздух грязный, дышать сложно. Зато атмосфера! Не нужно заморачиваться по поводу внешнего вида (шорты, майка и сланцы – это то, что нужно! Особенно в жару +38! На каждом шагу салоны foot-массажа, и город впечатляет своими размерами и высотами!*»

Даша ПАВЛОВСКАЯ.



АКЦЫЯ

Узяць аўтограф у алімпійскага чэмпіёна? Ніякіх праблем!

6 красавіка ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па фрыстайле пройдзе аўтограф-сесія зорных беларускіх фрыстайлістаў і галоўнага трэнера нацыянальнай каманды Мікалая Казекі.

Мерапрыемства, якое пачнецца ў 14.00, прымеркавана да дня адкрыцця цэнтра «Фрыстайл». У ім возьмуць удзел такія зоркі, як алімпійскія чэмпіёны **Антон Кушнір** і **Ганна Гуськова**, **Саша Раманоўская**, якая не так даўно стала чэмпіёнкай свету.

У прыхільнікаў, якія звычайна сочаць за выступленнямі куміраў па тэлевізары, з'явілася цудоўная магчымасць не толькі ўжывую пазнаёміцца са знакамітасцямі, але і ўзяць у іх аўтографы, сфатаграфавацца.

Дарэчы, падчас этапа Кубка свету ў Раўбічах балельшчыкі таксама маглі падтрымаць беларускіх фрыстайлістаў. Антон Кушнір распавёў тады, з якімі складанасцямі даводзіцца сутыкацца апошнім часам асабіста яму падчас спаборніцтваў.

«*Задаволены, што мы вытрымалі, бо ў сярэдзіне сезона хацеў ужо заканчваць*, – паведаміў ён tut.by. – *Урач раіў легчы ў бальніцу, таму што спіна ў мяне за тыдзень «прастрэліла» двойчы. У такім стане і скакаў на чэмпіянаце свету. Але не хачу пра гэта казаць. Натуральна, не хапала, каб скакаць трайное сальта з пяццю піруэтамі*».

Адным словам, жыццё спартсменаў – гэта не толькі медалі і промні славы. І пра ўсё гэта можна будзе пагутарыць з зоркамі, як кажуць, з вока на вока.

«*У гонар чатырохгоддзя з дня адкрыцця цэнтра «Фрыстайл» з 4 па 7 сакавіка гасцей таксама чакаюць конкурсы, квесты і інтэрактывы*, – паведамілі арганізатары свята. – *На тэрыторыі аквапарку будуць працаваць аніматары і гульнявая зона для дзяцей. Акрамя таго, для ўсіх прысутных будзе арганізавана тэматычная фотазона, майстар-класы, флэшмоб пад кіраўніцтвам прафесійных танцораў, падарункі і сюрпрызы. Таксама можна будзе ў гэтыя дні атрымаць бясплатную кансультацыю ад майстроў спорту па боўлінгу, більярдзе і дайвінгу*».

Так што будзе весела!

Алесь СВЯТЛАНІЧ.



З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Надзея АСТАПЧУК:

«З мяне патрабуюць 300 тысяч долараў»

Вядомая беларуская спартсменка распавяла «Народнай Волі», якую суму прызавых яна павінна вярнуць Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі.



Днямі стала вядома, што беларускія лёгкаатлеты **Аніс Ананенка** і **Алена Матошка** дыскваліфікаваны за парушэнне антыдопінгавых правілаў падчас Алімпійскіх гульняў 2012 года ў Лондане. Пры гэтым на лонданскай Алімпіядзе Ананенка заняў толькі 43-е месца, а Матошка – 25-е.

Нагадаем, што амаль адразу пасля Гульняў-2012 здарыўся яшчэ адзін гучны скандал. Золата ў кіданні ядра заняла беларуская спартсменка **Надзея Астапчук**, але праз некалькі дзён высветлілася, што ў яе крыві знайшлі забаронены прэпарат. Залаты медаль у спартсменкі забралі, на доўгі час яна была дыскваліфікавана.

Зараз Надзея зноў трэніруецца, але пакуль не можа выступаць на міжнародных спаборніцтвах…

– Па-ранейшаму мару вярнуцца ў вялікі спорт, – кажа **Надзея АСТАПЧУК**. – Але Міжнародная федэрацыя лёгкай атлетыкі паставіла пры гэтым умову, што я павінна вярнуць прызавыя, якія зарабіла на розных спаборніцтвах. І суму намалявалі такую, што столькі, напэўна, я на самай справе і не зарабіла.

– Пра якую суму ідзе размова?

– З мяне патрабуюць каля 300 тысяч долараў.

– Спонсары не маюць намеру вас падтрымаць?

– Зараз шукаем розныя варыянты, але пакуль нічога канкрэтнага. Частка ад гэтай сумы ў мяне ўжо ёсць, але 300 тысяч долараў не пацягну дакладна.

Беларуская федэрацыя як быццам і спрабуе нечым дапамагчы, але ж відавочна, што магчымасці ў яе таксама абмежаваныя.

– Вы ўжо гатовы да ўдзелу ў буйных спаборніцтвах?

– Я яшчэ ў мінулым годзе была да гэтага гатова, але рашэнне Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі ўсё зацягвалася, не ведала нават, які рахунак мне выставяць.

Але на ўзровень добры выйшла, за кароткі тэрмін кідала ўжо на 19 метраў. І спакойна магла дадаць яшчэ, каб прэтэндаваць не толькі на прызавыя месцы, але і на перамогу разлічваць.

– Як вы ўспрынялі навіну, што амаль праз сем гадоў пасля Алімпіяды ў Лондане працягваюць дыскваліфікацыю беларускіх удзельнікаў гэтых Гульняў?

– Я не ведаю цалкам усю сітуацыю, якая склалася з вышэйзгаданымі спартсменамі, але, як мне падаецца, барацьбу з допінгам вядуць не зусім правільна. Усе як быццам кінуліся на гэтую барацьбу, а ў той жа час забываюцца пра тое, каб развіваць гэты від спорту.


У лёгкай атлетыцы, калі не памыляюся, ужо 20 гадоў практычна не змяняюцца прызавыя. Затое з допінгам лёгкаатлетам дзяўбуць мазгі ледзь не штодзень. Вы паглядзіце, колькі зараз плацяць за перамогі ў кіберспорце! З такімі падыходамі хутка і ў спорце нікога не застанецца.

Алесь СІВЫ.

ФУТБОЛ

Паехалі!

У мінулыя выхадныя ў Беларусі стартаваў чэмпіянат Беларусі па футболе.



Вось вынікі 1-га тура: «Мінск» – «Віцебск» – 0:0, «Гомель» – «Нёман» (Гродна) – 2:3, Іслач» (Мінскі раён) – «Гарадзея» – 2:0, «Шахцёр» (Салігорск) – «Тарпеда» (Мінск) – 1:0, БАТЭ (Барысаў) – «Дняпро» (Магілёў) – 2:0, «Дынама» (Мінск) – «Славія» (Мазыр) – 1:0, «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) – «Дынама» (Брэст) – 1:2, «Слуцк» – «Энергетык-БДУ» (Мінск) – 0:0.

Калі казаць пра наведвальнасць, то больш за ўсё гледачоў прыйшло паглядзець старт сваёй каманды ў Барысаве – 5078 чалавек. Антырэкорды прыйшліся на матчы «Мінск»–«Віцебск» (950 балельшчыкаў) і «Іслач»–«Гарадзея» (800). У такіх выпадках кажуць: для каго гуляюць?

Турнірнае становішча

Каманды	Гульні	Выйгрышы	Нічыі	Паражэнні	Мячы	Ачкі
БАТЭ	1	1	0	0	2–0	3
Іслач	1	1	0	0	2–0	3
Нёман	1	1	0	0	3–2	3
Дынама (Бр)	1	1	0	0	2–1	3
Дынама (Мн)	1	1	0	0	1–0	3
Шахцёр	1	1	0	0	1–0	3
Віцебск	1	0	1	0	0–0	1
Мінск	1	0	1	0	0–0	1
Слуцк	1	0	1	0	0–0	1
Энергетык-БДУ	1	0	1	0	0–0	1
Гомель	1	0	0	1	2–3	0
Тарпеда-БелАЗ	1	0	0	1	1–2	0
Славія	1	0	0	1	0–1	0
Тарпеда	1	0	0	1	0–1	0
Гарадзея	1	0	0	1	0–2	0
Дняпро	1	0	0	1	0–2	0

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info
Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік і галоўны рэдактар
Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Пакольві ў рэдакцыі няма магчымасці рэцэнзаваць і вяртаць нявыкарыстаныя матэрыялы, яна пакідае права ўступаць у перапіску за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 01.04.2019 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 23 085 экз. Заказ № 1224.

